# Маўклівыя сведкі мінуўшчыны




*Фрагмент Радзівілаўскай карты Вялікага Княства Літоўскага (1648 г.).*

Шматвяковая гісторыя Беларусі багатая на разнастайныя падзеі. Звесткі аб многіх з іх, пакінуўшы глыбокі след на беларускай зямлі, дайшлі да нас праз стагоддзі. Бадай найбольш яскрава няўмольны ход гісторыі адлюстроўваюць старажытныя гарады. Цэнтры нацыянальнай свядомасці і культуры, яны сталі маўклівымі сведкамі грандыёзнага мінулага. У кожнага з іх сваё непаўторнае аблічча, свой лёс, здабыткі і страты. Адны славяцца выбітнымі ўраджэнцамі, іншыя — унікальнымі архітэктурнымі помнікамі.

Прадэманстраваць выключную ролю гарадскіх паселішчаў у гістарычным працэсе заклікана выстаўка кніг, твораў выяўленчага мастацтва і картаграфічных матэрыялаў «Старажытныя гарады Беларусі», якая днямі адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы. Асобнае месца сярод экспанатаў займае факсіміле знакамітай Радзівілаўскай карты ВКЛ выдання 1648 года. Аўтарамі першай дакладнай карты краіны з выявамі 1039 населеных пунктаў сталі мастак і гравёр пры двары Радзівіла Тамаш Макоўскі, а таксама галандскі гравёр і картограф Гесель Герытс. Найкаштоўнейшы артэфакт быў перададзены ў фонды беларускай кніжніцы Каралеўскай нацыянальнай бібліятэкай Нідэрландаў.